Дысцыпліна: **“Сучасная беларуская мова” (спец. “Беларуская філалогія”, 3 курс ФФ)**

Лекцыя па тэме: **Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове**

**1.** Лічэбнікі *два, дзве, абодва, абедзве, тры, чатыры* звязваюцца з назоўнікамі шляхам дапасавання (у рускай мове – кіравання):

*два сталы – два стала;*

*тры браты – три брата.*

**2.** Пры дробавых лічэбніках тыпу *два з палавінай (паловай); 3,5; 4,5* назоўнікі таксама ставяцца ў множным ліку, як і пры лічэбніках *2, 3, 4*, таму што слова ‘*палова’*, ‘*палавіна’* не кіруе назоўнікам, а зліваецца з папярэднім лічэбнікам у адно сінтаксічнае цэлае:

Н.скл. Р.скл.

*тры з паловай гады – три с половиной года.*

**3.** Дзеясловы *дзякаваць, аддзячыць, падзякаваць, выбачаць, дараваць* і г.д. кіруюць залежнымі назоўнікамі ці займеннікамі і патрабуюць ад іх формы Д. склону:

Д.скл. В.скл.

*дзякаваць сястры – благодарить сестру;*

*дараваць яму – простить его.*

**4.** Пры дзеясловах са значэннем руху, перамяшчэння (*ісці, ехаць, бегчы, ляцець* і інш.), калі яны маюць мэтавае прызначэнне, ужываюцца займеннікі або назоўнікі ў В. склоне з прыназоўнікам ***ПА***:

В.скл. Тв.скл.

*пайсці **па** ваду́ – пойти **за** водой;*

*ехаць **па** дзяцей – ехать **за** детьми;*

*прыйсці **па** соль – прийти **за** солью.*

Калі з дзеясловамі руху і волевыяўлення (*паслаць, накіраваць, адправіць* і г.д.) ужываюцца назвы ягад ці грыбоў ці самі словы *ягады, грыбы*, то назоўнікі маюць форму В. склону з прыназоўнікам ***У***:

В.скл.

*ехаць **у** суніцы;*

*пайсці **ў** грыбы.*

Такія ж словазлучэнні ўтвараюцца і са словамі *рыба, морква, малачай* (травяністая расліна з ядавітым сокам), *буракі*:

*паехалі **ў** рыбу.*

У складзе такіх словазлучэнняў можа ўжывацца і прыназоўнік ***ПА***:

*пайшлі **па** буракі.*

**5.** Пры дзеясловах *цешыцца, насміхацца, жартаваць, дзівіцца, здзеквацца* ўжываецца прыназоўнік ***З*** і назоўнік або займеннік у Р. склоне:

Р.скл. Тв.скл.

*насміхацца **з** іх – насмехаться **над** ними;*

*жартаваць **з** сябра – шутить **над** другом.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**6.** Пасля дзеясловаў *ажаніць (-цца)* у беларускай мове ўжываецца назоўнік ці займеннік у Тв. склоне з прыназоўнікам ***З***:

Тв.скл. М.скл.

*ажанілі **з** удавой – женили **на** вдове.*

**7.** Для беларускай мовы характэрна ўжыванне параўнальных словазлучэнняў, у якіх галоўнае слова (прыметнік ці прыслоўе) ужываецца ў простай форме вышэйшай ступені параўнання, а залежнае – у В. склоне з прыназоўнікам ***ЗА***:

В.скл. Р.скл.

*старэйшы **за** яе – старше её.*

**8.** Пры словах *хварэць, хворы* назоўнік ужываецца часцей за ўсё у форме В. склону і мае пры сабе прыназоўнік ***НА***:

В.скл. Тв.скл.

*хворы **на** грып – болен гриппом;*

*хворы **на** раматуз – болен ревматизмом.*

**9.** У складзе словазлучэнняў прыназоўнік ***ПА*** ўжываецца з назоўнікам ці займеннікам у мн. ліку М. склону. Паміж кампанентамі такіх словазлучэнняў выражаюцца пpасторавыя, часавыя, аб’ектныя і інш. адносіны:

М.скл. Д.скл.

*ісці **па** палях і лясах – идти **по** полям и лесам;*

*займалася **па** вечарах – занималась **по** вечерам.*

**10.** У дзеяслоўных словазлучэннях з прыназоўнікам ***ПРАЗ*** выражаюцца прычынныя адносіны. Залежны назоўнік ці займеннік прымае форму В. склону:

В.скл. Р.скл.

*спазніўся **праз** сястру – опоздал **из-за** сестры.*

**11.** У колькасна-іменных словазлучэннях са значэннем прыблізнай адлегласці, прасторы ўжываецца назоўнік у Р. склоне з прыназоўнікам ***ЗА***:

Р.скл. М.скл.

*метраў **за** 20 ад лесу – **в** метрах 20 от леса.*

**12.** У беларускай мове пашыраны словазлучэнні, у якіх назоўнік ужываецца ў Р. склоне з прыназоўнікам ***ЗА,*** тыпу:

Р.скл. Д.скл.

*забег **да** Івана – забежал **к** Ивану;*

*прыйшлі **да** нас – приехали **к** нам.*

**13.** Да слова *ДЗЯКУЙ*, ужытага ў ролі назоўніка, словы дапасуюцца ў ніякім і мужчынскім родзе:

*наш вялікі дзякуй* або *наша вялікае дзякуй.*

**14.** Дзеясловы маўлення, думкі, пачуцця (гаварыць, казаць, шаптаць, думаць, хваляваццa, клапаціцца і г.д.) і ўтвораныя ад іх назоўнікі кіруюць часцей за ўсё назоўнікамі ці займеннікамі ў В. склоне з прыназоўнікам ***ПРА***:

В.скл. М.скл.

*гаварыць **пра** падзеі – говорить **о** событиях;*

*думаць **пра** дзяўчыку – думать **о** девушке.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ